Источник: **«Звязда»** - **2012-07-10**

# Скарыны

**100 славутых прозвішчаў Беларусі**

**Прозвішча Скарына добра вядома не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Гэта прозвішча па праве адносіцца да ліку імёнаў сусветнага значэння і з'яўляецца гонарам беларускай нацыі: яно звязана з асобай самага знакамітага прадстаўніка эпохі Адраджэння на Беларусі, выдатнага дзеяча беларускай культуры XVI стагоддзя Францыска Скарыны — заснавальніка ўсходнеславянскага кнігадрукавання, гуманіста-асветніка, пісьменніка-публіцыста, перакладчыка, грамадскага дзеяча, пачынальніка новых для ўсходніх славян відаў літаратурнай творчасці, вучонага-філосафа і доктара медыцыны.**

## Паходжанне роду

Нарадзіўся Францыск Скарына ў сям'і полацкага купца Лукіяна (Лукі, Лукаша). Імя бацькі асветніка, па сведчанні гісторыкаў, узгадваецца ў спісе расійскіх пасольскіх прэтэнзій 1492 года да полацкіх купцоў. У Францыска быў старэйшы брат Іван, які ў пісьмовых дакументах адначасова фігуруе як віленскі мешчанін і палачанін. Продкі і бацькі Скарыны паводле веравызнання былі праваслаўнымі. Даследчыкі без сумнення выказваюцца аб тым, што і Францыск Скарына быў хрышчаны паводле праваслаўнага абраду і атрымаў адпаведнае грэка-славянскае імя, якога, на жаль, мы не ведаем. Пэўны час, у прыватнасці, на працягу XX стагоддзя ў навуковай літаратуры можна было сустрэць імя Георгій Скарына. Некаторыя вучоныя выказвалі меркаванні, што гэтае імя і з'яўляецца пачатковым праваслаўным хрысціянскім імем беларускага першадрукара. Але з пункту гледжанння сённяшняга скарыназнаўства, гэтая версія лічыцца памылковай. Імя ***Францыск (Францішак)*** было дадзена Скарыну ў адпаведнасці з каталіцкім календаром. У гістарычнай літаратуры выказваецца меркаванне, што паўторна Скарына мог быць ахрышчаны як католік яшчэ ў родным горадзе манахамі-бернардзінцамі, якія ў 1498 годзе заснавалі ў Полацку кляштар і касцёл у імя святога Францыска. Цяпер можна сустрэць два варыянты імені — Францыск і Францішак. У сувязі з гэтым у жыхароў Беларусі часам узнікае пытанне: які з варыянтаў адпавядае ісціне? Атрымаць адказ на вышэйназванае пытанне дапамагаюць скарынаўскія выданні, у якіх, па сведчанні гісторыка Г.Галенчанкі, Скарына больш за 100 разоў ужывае імя "Франциск", зрэдку — "Францишек". У актах Вялікага Княства Літоўскага на лацінскай мове беларускага першадрукара называюць "Franciscus", на старабеларускай — "Францышак", "Франъцышъко". У навуковым свеце існуюць розныя думкі і адносна паходжання прозвішча. Сам Францыск Скарына ў сваіх акафістах-акравершах называў сябе Скарыніч, яго родны брат Іван таксама згадваецца пад гэтым прозвішчам. Фінальная частка прозвішча -іч указвае, што Скарыніч — гэта нашчадак чалавека па імені Скарына.

Паводле адной з версій, першапачаткова імя ***Скарына*** магло быць дадзена рамесніку, які займаўся вырабам шкур на футра. Прыхільнікі гэтай версіі бачаць непасрэдную сувязь прозвішча са словам скура. У некаторых старажытных славянскіх мовах слова ***шкура*** мела фанетычны варыянт ***скора***. Гэты варыянт захаваўся і ў сучаснай польскай мове. Чалавек, які займаўся апрацоўкай шкур, у рускай мове называецца ***скорняк***, а ў старабеларускай мове называўся***скорникъ***. У сувязі з гэтым даследчыкамі выказваецца меркаванне, што такое сямейнае прозвішча Скарына вядзе свой пачатак ад родапачынальніка, які, верагодна, быў гарбаром, а нашчадкі яго

разбагацелі, пачалі займацца гандлем і сталі купцамі. Версія цікавая, але патрабуе свайго дакументальнага пацвярджэння.

**Яшчэ варыянты...**

Паводле другой версіі (на нашу думку, найбольш верагоднай), прозвішча ***Скарына*** ўтварылася ад аднайменнага старажытнага слова ***скорина***, якое ў старабеларускай мове, як і ў сучаснай ***(скарынка)*** абазначала "цвёрды вонкавы слой хлеба, пірага": "...коли муку житную у хлебе спекут, то тесто печеное солодко, а за скорину хотя ложки клади а в печи не печется... (Баркалабаўскі летапіс). Цалкам дапушчальна, што назва слоя хлеба магла быць выкарыстана пры ўтварэнні імя-мянушкі чалавека, а затым і яго прозвішча. У беларускай іменаслоўнай сістэме такія прозвішчы, што ўзніклі на аснове назваў прадуктаў харчавання, не такія і рэдкія: яны складаюць каля трох працэнтаў ад усіх прозвішчаў: ***Груца*** "густая крупеня, каша з ячных круп", *Кулеш* "негустая мучная каша з салам", ***Жур, Кулага*** "квашаная каша", ***Мякіш, Какорка*** "праснак, абаранак", ***Ляпёшка, Забела*** "тое, чым забельваюць страву, малако", ***Буката*** "булка хлеба", ***Бохан, Смятана, Піроґ, Кісель, Лойка*** і інш. Магчымы два шляхі ўзнікнення такога тыпу прозвішчаў: 1) яны даваліся людзям, якія любілі адпаведныя прадукты харчавання; 2) прозвішчы даваліся на аснове асацыяцыі, па прыкметах, характэрных для некаторых страў і прадуктаў харчавання.




● Прозвішча *Скарына* і вытворныя ад яго (Скарынец, Скарынка,Скарынкевіч, Скарынкін, Скарыннікаў)

Назвы паселішчаў

▲ в. Скарына, в. Скарынава Слабодка
▲ в. Скарыніна, хутар Скарынкі
△ в. Скарынчына
△ в. Скарынкі
▲ в. Скарынавічы
▲ в. і п. Скарынічы

Згодна з трэцяй версіяй, якую выказваюць асобныя вучоныя-лінгвісты, прозвішча ***Скарына*** з'яўляецца скарочаным варыянтам ад поўнага старажытнага славянскага імя ***Скарыслаў***. Сапраўды, у сучасных паўднёваславянскіх мовах (у прыватнасці, у сербскай і славенскай) і зараз сустракаецца імя Скарыслаў і яго скарочаныя варыянты ***Скарыша, Скарота*** і інш. Аднак гэтая версія патрабуе дадатковага даследавання.

**Нашчадкі або аднафамільцы Скарыны**

Францыск Скарына памёр у Чэхіі. Дакладная дата смерці невядома. Найбольш верагодна, што гэта здарылася каля 1551 года. У Францыска Скарыны былі два сыны — Сімяон і Францішак. Сімяон Скарына, як мяркуюць вучоныя-скарыназнаўцы, прадоўжыў справу бацькі: працаваў лекарам і садоўнікам і пэўны час жыў у Крумлёве і Інджыховым Градцы ў паўднёвай Чэхіі. Малодшы сын першадрукара Францішак Скарына загінуў у 1541 годзе падчас пажару ў Празе. Нашчадкі Сімяона Скарыны жылі ў Чэхіі і Славакіі. Дапускаюць, што з гэтай лініі паходзяць доктар медыцыны і філасофіі Станіслаў Стэнлі Скарына (Канада) і літаратар Юры (Ежы) Скарына (жыхар Мексікі). Адносна існавання нашчадкаў Францыска Скарыны ў Беларусі ніякіх звестак няма. Разам з тым, прозвішча ***Скарына*** і вытворныя ад яго ***Скарынец, Скарынка, Скарынкевіч, Скарынкін, Скарыннікаў*** даволі распаўсюджаныя на тэрыторыі нашай краіны і сустракаюцца фактычна ва ўсіх абласцях краіны: Брэсцкая вобласць: Бярозаўскі, Ганцавіцкі, Жабінкаўскі, Івацэвіцкі, Пружанскі раёны; Віцебская вобласць: Браслаўскі, Бешанковіцкі, Верхнядзвінскі, Віцебскі раёны; Гомельская вобласць: Буда-Кашалёўскі, Жлобінскі, Гомельскі раёны; Магілёўская вобласць: Асіповіцкі, Бялыніцкі, Круглянскі раёны; Мінская вобласць: Барысаўскі, Валожынскі, Маладзечанскі, Смалявіцкі, Старадарожскі раёны; Гродзенская вобласць: Слонімскі, Смаргонскі раёны.

Неаднаразова адзначаюцца і назвы беларускіх населеных пунктаў, утвораныя ад імя-мянушкі або прозвішча ***Скарына*** і яго вытворных: вёскі Скарына, Скарынава Слабодка (Жлобінскі раён Гомельскай вобласці), вёска Скарыніна, хутар Скарынкі (Гарадоцкі раён Віцебскай вобласці), вёска Скарынчына (Шумілінскі раён Віцебскай вобласці), вёска Скарынкі (Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці), вёска Скарынавічы (Маладзечанскі раён Мінскай вобласці), вёска і пасёлак Скарынічы (Мінскі раён).

**Ігар КАПЫЛОЎ, кандыдат філалагічных навук, вучоны сакратар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі**